**Даследаванне доўгатэрміновых наступстваў палітычных праследаў і міграцыі: кейс-кантрольнае даследаванне беларускіх уцекачоў і мігрантаў**

## Уводзіны

Пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года ў Беларусі пачаліся масавыя пратэсты з-за падазрэнняў у фальсіфікацыях. Улады жорстка задушылі пратэсты, што прывяло да масавых арыштаў, зняволення і гвалту ў дачыненні да пратэстоўцаў. У выніку ад 200 000 да 600 000 беларусаў пакінулі краіну, ратуючыся ад праследу.

Многія ўцекачы сутыкаюцца з сур'ёзнымі праблемамі псіхічнага здароўя, такімі як посттраўматычнае стрэсавае засмучэнне (ПТСЗ), дэпрэсія і трывожнасць. Аднак большасць даследаванняў па псіхічным здароўі ўцекачоў сканцэнтравана на рэгіёнах, такіх як Афрыка і Паўднёва-Усходняя Азія. Гэта даследаванне накіравана на запаўненне гэтага прабелу, засяродзіўшыся на беларускіх палітычных уцекачах і параўнаўшы іх досвед з досведам мігрантаў, якія пакінулі краіну па іншых прычынах.

## Мэты даследавання

- Параўнаць псіхічнае і фізічнае здароўе палітычных уцекачоў і мігрантаў, якія не падвяргаліся крымінальнаму палітычнаму праследу.
- Ацаніць іх адаптацыю ў новых краінах у сацыяльнай, працоўнай і сямейнай сферах.
- Вывучыць асаблівасці ПТСЗ і цяжкасці, з якімі сутыкаюцца палітычныя ўцекачы, з дапамогай інтэрв'ю.

## Асноўная гіпотэза

Людзі, якія перажылі палітычна матываванае зняволенне, з большай верагоднасцю пакутуюць на цяжкія формы ПТСЗ і іншыя псіхічныя засмучэнні.

## Дызайн даследавання

- Кейс-кантрольнае даследаванне з выкарыстаннем анкетавання і інтэрв’ю.
- Две групы:
  - **Група A:** Палітычныя ўцекачы, якія пакінулі краіну з-за праследу і маюць пацверджанне зняволення або рэпрэсій.
  - **Група B:** Мігранты, якія не маюць досведу крымінальнага палітычнага праследу (напрыклад, тыя, хто з’ехаў у пошуках працы або лепшых умоў жыцця).

## Крытэрыі ўдзелу

- Узрост ад 18 гадоў.
- Пражыванне па-за межамі Беларусі ад 6 месяцаў да 5 гадоў.
- Валоданне рускай або беларускай мовай.
- Выключаюцца: людзі з цяжкімі псіхічнымі захворваннямі, якія перашкаджаюць удзелу, а таксама асобы з невыразнымі прычынамі міграцыі.

## Графік даследавання

- **Лістапад – снежань 2024:** Распрацоўка метадалогіі.
- **Снежань 2024 – люты 2025:** Правядзенне анкетавання.
- **Сакавік – красавік 2025:** Аналіз дадзеных.
- **Красавік – май 2025:** Прэзентацыя вынікаў.

## Памер выбаркі

Не менш за 100 чалавек у кожнай групе для забеспячэння дакладнасці вынікаў.

## Збор дадзеных

- **Анкетаванне:** Праводзіцца анлайн праз бяспечную платформу.
- **Ацэнка псіхічнага здароўя:** Выкарыстоўваюцца стандартныя псіхалагічныя тэсты для дыягностыкі ПТСЗ, дэпрэсіі, трывожнасці, стрэсу і якасці жыцця.
- **Інтэрв’ю:** Ад 10 да 16 палітычных уцекач_ак пройдуць паглыбленыя інтэрв’ю пра свой досвед.

## Этыка і бяспека

- Канфідэнцыйнасць удзельнікаў будзе гарантаваная.
- Захоўванне дадзеных будзе адпавядаць міжнародным законам аб абароне персанальнай інфармацыі.
- Удзельніцы атрымаюць падтрымку і кантакты арганізацый, якія аказваюць псіхалагічную дапамогу.
- Даследаванне пройдзе зацвярджэнне адпаведнага этычнага камітэта.

## Аналіз дадзеных

- **Колькасны аналіз:** Выкарыстанне статыстычных тэстаў для параўнання псіхічнага здароўя ў дзвюх групах.
- **Якасны аналіз:** Інтэрв’ю будуць аналізавацца для выяўлення ключавых тэм.

## Публікацыя і распаўсюджванне вынікаў

- Вынікі даследавання будуць апублікаваныя ў навуковых часопісах і прадстаўленыя на канферэнцыях.
- Спрошчаная версія справаздачы будзе прадастаўленая арганізацыям, якія працуюць з уцекачамі.
- Ананімізаваныя дадзеныя будуць даступныя для даследчыкаў пры захаванні канфідэнцыяльнасці.

Гэта даследаванне дапаможа лепш зразумець праблемы, з якімі сутыкаюцца беларускія палітычныя ўцекачкі, і распрацаваць меры падтрымкі іх псіхічнага і фізічнага здароўя.